PolotskSU



**УДК 908(476)**

# АБ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў МЕДЫЦЫНСКІМ АСЯРОДДЗІ ПОЛАЦКА Ў СЯРЭДЗІНЕ XX СТАГОДДЗЯ

***канд. мед. навук А.М. ІЛЬНІЦКІ***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт),***
***А.В. КОЗЕЛ, д-р мед. навук К.І. ПРАШЧАЕЎ***
***(МСЧ ААТ «Палімір»)***

*Прадстаўлены досвед і фактычны матэрыял можна разглядаць як ці не першую ў полацкім краязнаўстве спробу такой сістэматызацыі. У краіне ў цэлым мясцовыя варункі гісторыі медыцыны вывучаліся ў адносінах да такіх служб, як дэрматавенералогія (Гродна), першасная медыка-сацыяльная дапамога (Рагачоў). Праблема абставін і выніку дзейнасці ўрачоў розных месцаў Беларусі дагэтуль дрэнна распрацавана, што патрабуе ўвагі з боку як гісторыкаў-даследчыкаў, так і мясцовых медыкаў. Цікавым будзе параўнанне стану ў абмяркоўваемай галіне ў Полацку і іншых месцах Беларусі. Навуковую дзейнасць урачоў Полацка ў 60-я гады мінулага стагоддзя можна ахарактарызаваць як напружаную і пленную, з улікам агульнай колькасці артыкулаў і іх якасці ва ўмовах адарванасці медыцынскага асяроддзя ад акадэмічных і навучальных устаноў медыцынскага профілю, цяжкія ў фінансава-эканамічным сэнсе ўмовы жыцця і дзейнасці. Безумоўна, гісторыя медыцыны невялікіх гарадоў, а таксама гісторыя навуковых даследаванняў правінцыяльных урачоў на Беларусі толькі чакае свайго руплівага даследчыка.*

**Уводзіны.** Гісторыі і культуры Полацка ў розныя перыяды яго развіцця прысвечаны шматлікія артыкулы. Тым не менш некаторыя фрагменты дагэтуль засталіся невывучанымі. Менавіта таму тэмай гэтага артыкула мы абралі маладаследаванае пытанне навуковай дзейнасці ўрачоў горада ў сярэдзіне дваццатага стагоддзя.

Актуальнасць гэтай праблемы абумоўлена, на наш погляд, наступнымі стасункамі.

1. Краязнаўчая літаратура, якая датычыцца Полацка, накіравана на раскрыцце, у асноўным, старажытных падзей і абставін, у лепшым выпадку ў ей ахопліваецца час пачатку прошлага стагоддзя. З залішней палітызаванасці навуковых прац апошняга перыяду, 50 – 60 гады XX стагоддзя не прыцягвалі ўвагу даследчыкаў з-за таго, што склад і сутнасць гісторыі «сацыялістычнага будаўніцтва» быў ім проста нецікавым. На наш погляд гэта збядняе краязнаўчую літатаратуру і патрабуе намаганняў па ліквідацыі своеасаблівых «белых плям», якія датычацца да гэтага часу.

2. Увага даследчыкаў звычайна прыцягнута да громкіх падзей і фактаў, тады як паўсядзенныя жыцце і дзейнасць асобных слаеў насельніцтва ў акрэслены перыяд ніхто ўважліва і з навуковых пазіцый не разглядаў. Гэта ў поўнай ступені можна аднесці да ўплывовай праслойкі мясцовай інтэлігенцыі – урачоў. Для медыкаў у тыя часы ўласцівы не толькі так званая штодзенная праца, але таксама і творчыя намаганні, навуковы пошук, вынікі якога друкуюцца на старонках спецыяльных прафесійных крыніц.

3. Навуковая дзейнасць і публіцыстычная актыўнасць з'яўляецца рэдкасцю для ўрачоў невялікіх гарадоў кшталту Полацка і таму патрабуе пільнага даследавання і вывучэння.

Такім чынам, аб'ектам праведзенага намі даследавання з'явілася навуковая дзейнасць урачоў горада Полацка ў 50 – 60 гады мінулага стагоддзя. Прадмет даследавання – іх навуковыя публікацыі ў рэцэнзуемых навуковых медыцынскіх часопісах як беларускіх, так і цэнтральных (на той час Беларусь існавала як БССР у складзе Савецкага Саюза).

**Асноўная часка.** У выніку праведзенага даследавання высветлілася, што агульная колькасць апублікаваных полацкімі ўрачамі артыкулаў склала 19, прычым іх можна класіфікаваць наступным чынам:

1) працы, прысвечаныя арганізацыі медыцынскай дапамогі;
2) аналітычныя артыкулы з абагульненнем асаблівага доследу;
3) апісанне незвычайных клінічных выпадкаў;
4) крытычныя нататкі.

Найбольшая колькасць артыкулаў належыць доктару І.Я. Крысталу (агульная колькасць, улічваючы сааўтарства – 11), урачу І.І. Фіхману – 7 артыкулаў, з улікам сааўтарства.

З агульнай колькасці артыкулаў 12 было апублікавана ў часопісе «Здравоохранение Белоруссии», 3 – у часопісе «Клиническая медицина» (Масква), 3 у часопісе «Советская медицина» (Масква), 1 артыкул у часопісе «Проблемы туберкулеза» (Масква).

Размеркаванне артыкулаў па гадах: у 50-я гады было апублікавана 5 артыкулаў, у 60-я – 14.

PolotskSU



Праблемы арганізацыі медыцынскай дапамогі асвятляліся ў чатырох артыкулах. Абмяркоўваліся такія актуальныя для гэтага перыяду развіцця сістэмы аховы здароўя праблемы, як патрэба ў другім хірургу-дублеру ў раенных бальніцах (аўтар І.Я. Крыстал), барацьба з траўматызмам ва ўмовах вытворчасці (І.І. Фіхман), новыя формы хірургічных справаздач (І.Я. Крыстал), неабходнасць экстранага абследавання няшчасных выпадкаў на прамысловых прадпрыемствах (І.І. Фіхман, І.Я. Крыстал, Р.І. Сцепаненка) [1 – 4].

Трэба зазначыць, што названыя артыкулы носяць палемічны характар, у іх падкрэсліваецца неабходнасць пэўных рэформ з-за наяўнасці застарэлых форм працы ў медыцыне, якія перашкаджаюць больш пленнай дзейнасці ўстаноў аховы здароўя і зніжаюць якасць медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Напрыклад, І.Я. Крыстал падкрэслівае, што на момант 50-х гадоў маюць месца пэўныя зрухі ў структуры кантынгенту хірургічных хворых, а нарматывы нагрузкі на ўрача не мяняюцца. Адзіны хірург, які працуе ва ўмовах невялікай раённай бальніцы, не ў стане якасна выканаць патрабаванні па дыспансерызацыі хворых, працяглы час адсутнічае з-за неабходнасці працаваць на прызыўных участках, экстраных выклікаў на месцы. Гэта стварае базу для таго, што ў шэрагу выпадкаў цяжкія хворыя транспартуюцца ў іншыя, больш адлеглыя, медыцынскія ўстановы, што вядзе да пагаршэння іх стану, павелічэнню колькасці дрэнных зыходаў лячэння. Гэты ж доктар, з'яўляючыся галоўным хірургам Полацкага аблздраўаддзела (абласны аддзел аховы здароўя), ужо ў іншым артыкуле робіць трапныя прапановы па ўвядзенню новых элементаў у выніковыя гадавыя справаздачы па дзейнасці хірургічнай службы [1].

Цікавымі ўяўляюцца артыкулы па прафілактыцы прамысловага траўматызму. Яны зроблены на падставе аналізу некаторых выпадкаў такого кшталту, змяшчаюць падрабязнае апісанне гэтых выпадкаў. Трэба зазначыць, што ў якасці выйсця з сітуацыі па высокаму ўзроўню прамысловага траўматызму, прапануецца больш увагі ўдзяляць пытанням дысцыпліны працы з боку медыцынскіх устаноў. Сення існуе іншая думка, згодна якой медыцына павінна ў большай ступені займацца лячэннем, а прафілактычныя пытанні згодна з рэкамендацыямі медыкаў робяць усе ж такі непасрэдна прамыслоўцы. Ва ўсякім разе, пункт гледжання аўтараў супадае з дактрынай савецкай сістэмы аховы здароўя таго часу [4].

Да аналітычных артыкулаў з абагульненнем асаблівага досведу можна аднесці працу на той час загадчыка хірургічнага аддзялення Полацкай абласной бальніцы імя Леніна І.Я. Крыстала «Прафілактыка нагнаення аперацыйнай раны пасля вострага апендыцыту». Мы не будзем аналізаваць медыцынскі бок артыкула ў сувязі з тым, что прапануемы намі артыкул не разлічаны на медыцынскую аудыторыю, але спынемся на яго метадалагічным баку. Артыкул мае літаратурны экскурс у праблему, у якім прааналізаваны і супастаўлены розныя погляды не толькі айчынных, але і замежных даследчыкаў, апісана арыгінальная методыка прафілактыкі нагнаення аперацыйных ран пасля вострага апендыцыту. Фактычныя дадзеныя ўключаюць 356 назіранняў выпадкаў вострага апендыцыту, вынікі прадстаўлены ў выглядзе лічбаў метадам апісальнай статыстыкі. Цікава зазначыць, што высновы аўтара з поспехам выкарыстоўваюцца і ў сучасных умовах хірургічнай дзейнасці [5].

Асноўная маса навуковых прац полацкіх медыкаў прысвечана апісанню цікавых і незвычайных клінічных выпадкаў. Некаторыя з іх і дагэтуль прадстаўляюць несумненную каштоўнасць для практыкуючага ўрача. Сярод апісанняў можна зазначыць наступныя: выпадкі прабадзення рака страўніка, лячэнне ўкусу ядавітай змяі, пнеўматоз кішэчніка, выпадак агнястрэльнага ранення жывата цяжарнай жанчыны на IX месяцы цяжарнасці (І.Я. Крыстал); непраходнасць кішэчніка, выкліканая запаленнем меккелева дывертыкула (А.С. Калугін); выпадак ізаляванага лімфагранулематоза страўніка (І.І. Фіхман, І.Я. Крыстал); шматлікія перфарацыі страўніка пры раку падстраўнікавай залозы (І.Я. Крыстал, Б.Л. Храпуновіч); перакручаная кіста яічніка і востры апендыцыт падчас родаў (І.І. Фіхман, В.П. Косарава); востры апендыцыт пасля «апендэктаміі», аб сухотах шчытападобнай залозы (І.І. Фіхман, І.Я. Крыстал); прабадная язва страўніка ў хворага з адваротным распалажэннем унутраных ворганаў (І.І. Фіхман) і інш. Усе згаданыя артыкулы напісаны добрай літаратурнай мовай, а змешчаныя выпадкі з'яўляюцца сапраўды рэдкімі і цікавымі, як ужо падкрэслівалася, і для сенняшняй урачэбнай аўдыторыі [6 – 16].

Востра палемічны характар мае артыкул І.Я. Крыстала «З нагоды артыкула А.А. Шота «Да пытання этыялогіі, патагенеза і лячэння апендыцыта», надрукаваны ў часопісе «Здравоохранение Белоруссии», № 4 за 1956 год.

А.А. Шот – вядомы прафесар-хірург, які працяглы час узначальваў кафедру факультэцкай хірургіі Мінскага медыцынскага інстытута. Трэба зазначыць, што ў сваім артыкуле ен вызначыў памылковую (канешне, с погляду ўжо нашага часу) канцэпцыю двухбаковай каляныркавай навакаінавай блакады для лячэння вострага апендыцыта.

І.Я. Крыстал аргументавана абвяргае асноўныя палажэнні артыкула А.А. Шота і пераканаўча даказвае перавагу аператыўнага шляху лячэння гэтага захворвання [17].

PolotskSU



Такім чынам, намі дадзена кароткая характарыстыка навуковай дзейнасці полацкіх урачоў. Трэба падкрэсліць некаторыя яе рысы.

У сувязі з тым, што ўсе аўтары з'яўляліся прадстаўнікамі так званых практычных, а не навучальных ці навукова-даследчых устаноў, артыкулы ў асноўным носяць абагульняючы характар, апісваюць выпадкі з практыкі. Ім часам бракуе пэўнай метадычнай базы, статыстычнага аналізу. Між тым, несумненна, гэта вялікае дасягненне для таго часу.

У 50-я гады мінулага стагоддзя жыцце звычайных грамадзян было няпростым: «насельніцтва горада хутка расло. У 1959 годзе ў Полацку было 44 тыс. жыхароў. Жыллевае будаўніцтва не паспявала за тэмпамі росту насельніцтва. Кватэр не хапала. Некаторыя сем'і вымушаны яшчэ былі жыць у зямлянках, нядобраўпарадкаванай заставалася частка вуліц. У горадзе не хапала вады, паліва. Унутрыгарадскі транспарт працаваў з перапынкамі».

Мы спецыяльна выкарастылі гэты ўрывак з грунтоўнай кнігі «Полацк», каб паказаць, наколькі цяжкімі былі ўмовы жыцця ў той час і што, нягледзячы на гэта, лепшыя ўрачы знаходзілі мужнасць і час займацца навуковай дзейнасцю. Дарэчы, сістэма аховы здароўя на той час не была вельмі вялікай – працавала бальніца на 250 ложкаў, гарадская паліклініка, радзільнае аддзяленне. Але сітуацыя паляпшалася, і напрыканцы 50-х гадоў у горадзе мелася ўжо 10 лячэбных устаноў, у якіх працавала 569 спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй медыцынскай адукацыяй (урачоў – 138). Паступова раслі асігнаванні на ахову здароўя. Так, у 1955 годзе было расходавана 8,7 млн. рублеў, а ў 1956 годзе – 11,6 млн. рублей. Дарэчы, гэта складала 40 % ад агульнай вагі гарадскога бюджэту [18].

Як адзначалася вышэй, вялікая колькасць навуковых прац належыла І.Я. Крысталу. Ісак Якаўлевіч нарадзіўся ў 1906 годзе, прайшоў цікавае жыцце. Працоўную кар'еру пачаў ва ўзросце 16 гадоў, калі пайшоў працаваць слесарам на фабрыку, па вечарах вучыўся на рабфаку. Пасля гэтага здолеў паступіць на медыцынскі факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў з адзнакай, быў запрошаны ў аспірантуру, застаўся працаваць асістэнтам прафесара. На жаль, наступіўшая вайна перапыніла планы, падчас якой ен працаваў галоўным урачом аднаго з франтавых шпіталяў, узнагароджаны шматлікімі медалямі і іншымі ўзнагародамі. Пасля заканчэння вайны доктар Крыстал прыязджае ў Полацк, працуе хірургам, загадчыкам хірургічнага аддзялення бальніцы.

Цікавай з'яўляецца вытрымка з артыкула Г. Голанда «Наш добры доктар», змешчанага ў мясцовай полацкай газеце «Сцяг камунізму» ад 4 кастрычніка 1966 года. Павагу да ўрачэбнай дзейнасці доктара Крыстала і ўвогуле атмасферу таго часу перадае канцоўка артыкула: «Найбольшы росквіт сваіх творчых сіл праявіў доктар у нашым родным горадзе. Здзіўляешся яго нястомнай энергіі, юнацкаму задору. Усе яго жыцце аддадзена людзям, іх здароўю. Дарагога юбіляра сардэчна віншуе ўвесь Полацк… Усе яму жадаюць здароўя, шчасця, доўгіх гадоў жыцця…» [19]. І.Я. Крыстал – безумоўна адна з найбольш яркіх постацей свайго пакалення ўрачоў горада Полацка.

На наш погляд, цікавым будзе параўнанне стану ў абмяркоўваемай галіне ў Полацку і іншых месцах Беларусі. Цікавы вопыт назапашаны ў Берастовічах, дзе створаны музей медыцыны; Гродна, у якім функцыяніруе музей-аптэка.

На жаль, у Полацку гістарычныя веды аб развіцці медыцыны амаль не сістэматызаваны, адсутнічаюць адпаведныя структуры (музей, «чырвоны куток» і інш.) як у культурных, так і ў медыцынскіх установах. Прадстаўлены досвед і фактычны матэрыял можна разглядаць як ці не першую ў полацкім краязнаўстве спробу такой сістэматызацыі.

У краіне ў цэлым мясцовыя варункі гісторыі медыцыны вывучаліся ў адносінах да такіх служб, як дэрматавенералогія (Гродна), першасная медыка-сацыяльная дапамога (Рагачоў). Безумоўна, гісторыя медыцыны невялікіх гарадоў, а таксама гісторыя навуковых даследаванняў правінцыяльных урачоў на Беларусі толькі чакае свайго руплівага даследчыка.

**Высновы**

1. Навуковую дзейнасць урачоў Полацка ў 60-я гады мінулага стагоддзя можна ахарактарызаваць як напружаную і пленную, з улікам агульнай колькасці артыкулаў і іх якасці ва ўмовах адарванасці медыцынскага асяроддзя ад акадэмічных і навучальных устаноў медыцынскага профілю, цяжкія ў фінансава-эканамічным сэнсе ўмовы жыцця і дзейнасці.

2. Асноўны аб'ем навуковай прадукцыі полацкіх урачоў таго часу складаюць абагульняючыя артыкулы, прыклады і рэдкія выпадкі з асабістага досведу. У навуковых працах амаль не сустракаецца ўжыванне метадаў статыстычнай апрацоўкі дадзеных, што можа быць растлумачана практычным кірункам дзейнасці аўтараў і пэўным недахопам навуковай падрыхтоўкі ў сувязі з аддаленасцю ад навуковых устаноў і адсутнасцю навуковага кіраўніцтва спецыялістаў з навуковымі ступенямі і званнямі.

PolotskSU



3. Найбольш выбітнай постаццю ўрачэбнага асяроддзя таго часу з'яўляецца ўрач-хірург І.Я. Крыстал, якому належыць большая частка з захаваўшыхся навуковых прац у спецыяльных часопісах. У яго артыкулах бачна прафісійная годнасць і бескампраміснасць, у тым ліку падчас палемікі са знанымі аўтарытэтамі.

4. Праблема абставін і выніку дзейнасці ўрачоў розных месцаў Беларусі дагэтуль дрэнна распрацавана, што патрабуе ўвагі з боку як гісторыкаў-даследчыкаў, так і мясцовых медыкаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Кристал, И.Я. В районных больницах нужен второй хирург / И.Я., Кристал // Здравоохранение Белоруссии. – 1954. – № 3. – С. 55.
2. Фихман, И.И. Значение экстренного извещения и обследования в борьбе с производственным травматизмом / И.И. Фихман // Здравоохранение Белоруссии. – 1964. – № 4. – С. 51 – 53.
3. Кристалл, И.Я. О новых формах хирургических отчетов / И.Я. Кристалл // Клиническая медицина. – 1949. – № 4. – С. 53 – 54.
4. Фихман, И.И. О роли обследования экстренного обследования несчастных случаев на производстве / И.И. Фихман, И.Я. Кристалл, Р.И. Степаненко // Советское здравоохранение. – 1963. – № 5. – С. 21 – 22.
5. Кристал, И.Я. Профилактика операционной раны после острого аппендицита / И.Я. Кристал // Клиническая медицина. – 1957. – № 2. – С. 62 – 64.
6. Кристал, И.Я. Три случая прободения рака желудка / И.Я. Кристал // Здравоохранение Белоруссии. – 1955. – № 4. – С. 55 – 56.
7. Кристал, И.Я. Лечение укуса ядовитой змеи / И.Я. Кристал // Здравоохранение Белоруссии. – 1956. – № 7. – С. 66 – 67.
8. Кристал, И.Я. Пневматоз кишечника / И.Я. Кристал // Советская медицина. – 1954. – № 12. – С. 36 – 37.
9. Кристал, И.Я. Случай огнестрельного ранения живота Беременной женщины на IX месяце беременности / / И.Я. Кристал // Клиническая медицина. – 1957. – № 8. – С. 71 – 72.
10. Калугин, А.С. Непроходимость кишечника, вызванная воспалением меккелева дивертикула и остатком зародышевого желточного протока / А.С. Калугин // Здравоохранение Белоруссии. – 1958. – № 5. – С. 55.
11. Фихман, И.И. Случай изолированного лимфогранулематоза желудка / И.И. Фихман, И.Я. Кристал // Клиническая медицина. – 1965. – № 7. – С. 138 – 139.
12. Кристал, И.Я. Множественные перфорации желудка при раке поджелудочной железы / И.Я. Кристал, Б.Л. Храпунович // Здравоохранение Белоруссии. – 1963. – № 1. – С. 5.
13. Фихман, И.И. Перекрученная киста яичника и острый аппендицит в родах / И.И. Фихман, В.П. Косарева // Здравоохранение Белоруссии. – 1965. – № 5. – С. 76 – 77.
14. Фихман, И.И. Острый аппендицит после «аппендэктомии» / И.И. Фихман, И.Я. Кристал // Здравоохранение Белоруссии. – 1968. – № 1. – С. 15.
15. Кристал И.Я. О туберкулезе щитовидной железы / И.Я. Кристал, И.И. Фихман // Проблемы туберкулеза. – 1965. – № 1. – С. 86 – 87.
16. Фихман, И.И. Прободная язва желудка у больного с обратным расположением внутренних органов / И.И. Фихман // Здравоохранение Белоруссии. – 1966. – № 12. – С. 68.
17. Кристалл, И.Я. По поводу статьи А.В. Шотта «К вопросу этиологии, патогенеза и лечения аппендицита / И.Я. Кристал // Здравоохранение Белоруссии. – 1956. – № 4. – С. 68 – 69.
18. Полоцк: истор. очерк / АН БССР, ин-т истории; редколл. П.Т. Петриков (отв. ред.) [и др.]. – Мінск: Наука и техника, 1987. – 320 с.
19. Голанд, Г. Наш добры доктар / Г. Голанд // Сцяг камунізму. – 1966. – 4 кастрычніка.


*Пастуніў 14.03.2006*